**Чарняўская, В.** Адным з першых пабываў у Афгане / В. Чарняўская // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2019. — 16 лют. — С. 2.

## АДНЫМ З ПЕРШЫХ ПАБЫВАЎ У АФГАНЕ


Тадэвуш Мікалаевіч і Марына Генадзьеўна Кавальчукі

*Усё жыццё **Тадэвуша Мікалаевіча Кавальчука** з вёскі Каўшэлева звязана з тэхнікай. Падчас тэрміновай воінскай службы ў Афганістане ён быў старшым механікам-вадзіцелем, пасля дэмабілізацыі – вадзіцелем грузавога аўтамабіля МАЗ-537 на Ігналінскай атамнай электрастанцыі ў Літве. Затым вярнуўся на радзіму і звыш 20 гадоў адпрацаваў механізатарам на ўчастку ў Каўшэлеве, які ў цяперашні час уваходзіць у склад ААТ «Жвіранка». Тадэвуш Мікалаевіч – адзінз першых жыхароў нашага раёна, чыя воінская служба праходзіла на тэрыторыі Дэманратычнай Рэспублікі Афганістан.*

– Першы год службы праходзіў на Украіне, – падзяліўся ўспамінамі Тадэвуш Кавальчук. – На пачатку 1980 года мы на грузавых аўтамабілях з паўпрычэпамі перавозілі тэхніку: танкі і БМП ад мяжы – на тэрыторыю Савецкага Саюза. А потым салдат сабралі і аб'явілі, што наша далейшая служба будзе праходзіць у паўднёвых краінах. У той час загады не абмяркоўваліся: нам сказалі ехаць – і мы паехалі. Камандаванне растлумачыла, што мы выконваем інтэрнацыянальны доўг. І для зусім маладых хлопцаў гэта былі не проста словы. Таму ніхто не адмовіўся ад службы ў Афгане. Ды і не ведалі мы яшчэ, што нас чакае наперадзе. Вайна ў Афгане на той момант для савецкіх салдат доўжылася яшчэ толькі год. Спачатку нас прывезлі на тэрыторыю Узбекістана для перападрыхтоўкі і акліматызацыі, а ўжо адтуль накіравалі ў Афганістан.

Служба на тэрыторыі афганскага горада Баграм для 19-гадовага юнака працягвалася з красавіка па снежань 1980 года. Старшы механік-вадзіцель Тадэвуш Кавальчук на аўтамабілі МАЗ-537 у воінскія часці дастаўляў тэхніку і разнастайныя грузы. Неаднаразова даводзілася бываць пад абстрэламі, востра адчуваўся і недахоп звычайнай пітной вады. Але лёс быў літасцівы да маладога яфрэйтара. За перыяд службы ў Афгане Тадэвуш Мікалаевіч Кавальчук узнагароджаны нагрудным знакам «Воіну-інтэрнацыяналісту» і некаторымі іншымі ўзнагародамі. А пасля дэмабілізацыі доўга затрымлівацца дома не стаў – праз паўтара месяца пасля вяртання ў родную вёску Запруддзе накіраваўся на маладзёжную будоўлю ў Літву, у той перыяд актыўна вялося

будаўніцтва Ігналінскай атамнай электрастанцыі. У Літве пазнаёміўся з будучай жонкай Марынай, стварыў сваю сям'ю. На тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі нарадзіліся дзеці Тадэвуша і Марыны – дачка Юлія і сын Дзмітрый. Сям'я Кавальчукоў спачатку працавала на будаўніцтве атамнай электрастанцыі, потым разам з іншым мясцовым насельніцтвам была задзейнічана на яе абслугоўванні. У Літве Кавальчукі пражылі 13 гадоў. А ў 1993 годзе рускім і беларусам заставацца там ужо было вельмі складана, і людзі сталі масава пакідаць краіны Прыбалтыкі. Сям'я Кавальчукоў вырашыла вярнуцца ў Шаркаўшчынскі раён, на радзіму Тадэвуша Мікалаевіча, дзе ў вёсцы Каўшэлева мужчына ўладкаваўся працаваць механізатарам, а яго жонка Марына – фельчарам мясцовага ФАПа. Ад гаспадаркі адразу атрымалі дом. І Тадэвуш Мікалаевіч на працягу 22 гадоў адпрацаваў механізатарам на тэрыторыі сучаснага ААТ «Жвіранка». Тры гады назад ён выйшаў на заслужаны адпачынак. Будучы ўжо на пенсіі, дома трымае даволі вялікую гаспадарку, займаецца развядзеннем свойскай жывёлы (качак і коз), даглядае ўласны аўтамабіль, за рулём якога праводзіць шмат часу. Кожны дзень адвозіць на працу жонку. 25 гадоў прайшло з той пары, як Марына Генадзьеўна працуе фельчарам Каўшэлеўскага фельчарска-акушэрскага пункта.

Жыццё вяскоўцаў ідзе сваёй чарадой. Дзеці ўжо выраслі і ў гарадах стварылі свае сем'і. У Тадэвуша і Марыны трое ўнукаў. Усім ім вельмі падабаецца адпачываць у Каўшэлеве, асабліва летам.

**Вольга ЧАРНЯЎСКАЯ**